**Галерэя "Лабірынт" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі запрашае гледачоў на выстаўку пад назвай "Слова", што прысвечана 1150-годдзю славянскага пісьменства. У экспазіцыі прадстаўлены ўзоры каліграфіі і карціны, дзе спалучаюцца выява і тэкст.**

# "Слова" ў "Лабірынце"

Мастакі, якія бяруць удзел у выстаўцы, з'яўляюцца сябрамі творчай суполкі "ЛітАрт", што ўзначальвае прафесар, лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне" Павел Семчанка. Іх намаганнямі беларуская каліграфія вядомая за межамі нашай краіны, а творы яскрава сведчаць, што камп'ютарная графіка не замяніць руку майстра. Два каліграфы — беларус Генадзь Мацур і кітаец Лі Цю — правялі для гледачоў майстар-клас. Дарэчы, работы згаданага кітайскага творцы эфектна глядзяцца разам з кірылічнымі ды лацінкавымі кампазіцыямі.

Асобны раздзел экспазіцыі складаюць работы вядомага дызайнера Уладзіміра Цэслера. Вартыя ўвагі творы жывапісцаў Анатоля Кузняцова, Андрэя Плясанава, Антаніны Фалей.



Пад такой назвай у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі распачалася выстаўка з нагоды Дня беларускага пісьменства.

